# Сеткавы праект
# “Проста пра галоўнае!”

### ПРЫКЛАД РАБОТЫ КАМАНДЫ

## Падрыхтоўчы этап

Пасля знаёмства са стартавай прэзентацыяй сеткавага вучэбнага праекта “Проста пра галоўнае!” мы зразумелі, што жаданне прыняць у ім удзел нас перапаўняе. Мы згрупаваліся і стварылі каманду “МаРа”.

**Выбралі сабе дэвіз:**




**Намалявалі эмблему каманды:**



**Размеркавалі ролі:**

| | |
|---|---|
|  | **КАПІТАН - Дар’я С.** |
|  | **НАСТАЎНІК - Валерыя С.;<br>Марына А.** |
|  | **ДАСЛЕДЧЫК - Люцына З.;<br>Марыя Г.** |
|  | **ТЭХНІК - Вераніка Б.;<br>Аляксандра Д.** |
|  | **СПІКЕР - Эльвіра П.** |

Мы пазнаёміліся з правіламі бяспечных паводзін у Інтэрнеце, правіламі работы ў групе; абмеркавалі асноватворнае пытанне і праблемныя пытанні кожнага этапа. З дапамогай каардынатара нашай каманды Святланы Дзімітрыеўны кожны член каманады запоўніў дзве калонкі ў табліцы В-Ц-Д. Мы стварылі сайт каманды і размясцілі на ёй візітоўку каманды.

## *Асноўны этап*

# Этап 1. “Людзей слухай, а свой розум май”

### Праблемнае пытанне:

Якія праблемы і складанасці ўзнікаюць пры вывучэнні і выкладанні тэмы “Галоўныя члены сказа”?

**Гіпотэза** - вывучэнне тэмы “Галоўныя члены сказа” праблемнае і складанае.

**Мэта** - удакладніць праблемныя і цяжкія для засваення пытанні тэмы і скласці план даследавння.
Задачы этапа:
1. Пазнаёміцца з тэарэтычным матэрыялам, методыкай правядзення эксперыментальнага даследавання.
2. Сфармуляваць мэты і задачы даследавання.
3. Апісаць жадаемыя вынікі.

**Ход даследавання:**

1. Правялі мазгавы штурм, выканалі тэст “Галоўныя члены сказа”.
2. Прааналізавалі навуковую і навукова-метадычную літаратуру па тэме праекта. Вынікі аналізу размясцілі на сайце каманды (прэзентацыя).
3. Распрацавалі анкету для настаўнікаў I і II ступені агульнай сярэдняй адукацыі і выкладчыкаў ВНУ з мэтай высвятлення цяжкіх і праблемных пытанняў па тэме праекта; анкеты абмеркавалі на вебінары і затым атрыманы пасля абмеркавання варыянт анкет размясцілі на сайце каманды.
4. Правялі анкетаванне настаўнікаў I і II ступені агульнай сярэдняй адукацыі і выкладчыкаў ВНУ; апрацавалі і прааналізавалі анкеты; вынікі размясцілі на сайце каманды.

5. Арганізавалі і правялі onlain-канферэнцыю, на якой абмеркавалі атрыманыя вынікі і вызначылі праблемныя  і цяжкія для засваення пытанні тэмы "Галоўныя члены сказа".
6. Адабралі сродкі і спосабы правядзення даследавання на наступным этапе праекта.
7. Запоўнілі табліцу перамяшчэння каманды, асабістага ўдзелу, выканалі самаадзнаку; афармілі партфоліа.

Рэфлексія

# Этап 2. “Разумная дачка”

## Праблемнае пытанне:

Што нам дапаможа цікава і лёгка засвоіць тэму?

**Гіпотэза** - выкарыстанне заданняў і практыкаванняў, падрыхтаваных у сервісах Web 2.0 дапаможа цікава і лёгка засвоіць тэму “Галоўныя члены сказа”.

**Мэта** - удакладніць метадыку складання лінгвістычных казак і сабраць навуковы і метадычны матэрыял для іх напісання.

**Задачы этапа:**

1. Даследаваць метадыку складання лінгвістычных казак.

2. Сабраць навуковы і метадычны матэрыял для  напісання лінгвістычных казак.

3. Падрыхтаваць дыдактычны матэрыял для напісання лінгвістычных казак.

**Ход даследавання:**

1. Правялі мазгавы штурм.
2. Напісалі эсэ  "Што я ведаю пра лінгвістычную казку?" і размясцілі на сайце каманды.
3. Склалі разнастайны дыдактычны матэрыял для зборніка практыкаванняў па тэме “Галоўныя члены сказа” (пазлы, крыжаванкі, інтэрактыўныя плакаты, відэа) падрыхтаваны пры дапамозе сервісаў Web 2.0.
4. Склалі канспекты для вывучэнні галоўных членаў сказа ў  пачатковых класах (прэзентацыя), сярэдняй школе і ВНУ.
5. Правялі апрабаванне матэрыялу і  размяцілі на сайце каманды.

6. Запоўнілі табліцы перамяшчэння каманды, асабістага ўдзелу, самаадзнакі; афармілі партфоліа.

**Вынікі:**

У выніку работы над праблемным пытаннем, правядзення даследавання і аналізу атрыманых вынікаў мы прыйшлі да высновы, што выкарыстанне заданняў і практыкаванняў, падрыхтаваных у сервісах Web 2.0 дапаможа цікава і лёгка засвоіць тэму "Галоўныя члены сказа".

Рэфлексія

**Выкарыстаныя крыніцы:**


1. Лингвистические сказки [Электронный ресурс]  - Режим доступа:https://textarchive.ru/c-1381743-pall.html . - Дата доступа: 01.04.2020
2. Лингвистические сказки на уроках русского языка [Электронный ресурс] / Golos.io. - Режим доступа: http://at1952.narod.ru/teller.html#story - Дата доступа: 01.04.2020.
3. Примеры лингвистических сказок [Электронный ресурс] / google-info.org. - Режим доступа: https://clck.ru/NEp7F. - Дата доступа: 02.04.2020.


# Этап 3. "1000 і адна казка"

## Праблемнае пытанне:

Ці ўмеем мы расказваць казкі?

**Гіпотэза** - лінгвістычная казка, пры ўмелым яе выкарыстанні, дапаможа цікава і лёгка засвоіць тэму "Галоўныя члены сказа".

**Мэта** - скласці і аформіць лінгвістычныя казкі пеа пытаннях тэмы "Галоўныя члены сказа".

**Задачы этапа:**

1. Скласці лінгвістычныя казкі для вывучэння тэмы "Галоўныя члены сказа".

2. Аформіць лінгвістычныя казкі.

3. Апісаць жадаемыя вынікі.

**Ход даследавання:**

1. Напісалі і афармілі пры дапамозе сервісаў Web 2.0 лінгвістычныя казкі па пытаннях тэмы "Галоўныя члены сказа" і размясцілі іх на сайце каманды.
2. Напісалі эсэ.
3. Запоўнілі табліцу перамяшчэння каманды, асабістага ўдзелу, правялі самаадзнаку; афармілі партфоліа.

Рэфлексія.